Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

# ЗАХОДНІ РЭГІЁН БЕЛАРУСІ ВАЧЫМА ГІСТОРЫКАЎ І КРАЯЗНАЎЦАЎ

Зборнік навуковых артыкулаў

Гродна 2006

*С.А. Фядзечка, ПФ БДЭУ, г. Мінск*

# БЕЛАРУСЫ ЯК НАЦЫЯНАЛЬНАЯ МЕНШАСЦЬ У КАНТЭКСЦЕ ВЕРСАЛЬСКАЙ СІСТЭМЫ

Ва ўмовах стварэння новай польскай дзяржаўнасці асноўнай крыніцай рэгулявання становішча нацыянальных меншасцей на яе тэрыторыі было міжнароднае права. Па заканчэнні першай сусветнай вайны ў Еўропе ствараецца сістэма бяспекі, заснаваная на Версальскіх мірных пагадненнях. Галоўнай геапалітычнай прычынай падпісання шэрагу дагавароў стаў не толькі факт сканчэння вайны, але і факт узнікнення новых дзяржаў на палітычнай карце Еўропы. Неўпэўненасць краін-пераможцаў у этнічнай сітуацыі ў новых межах паміж такімі дзяржавамі, як Чэхаславакія, Румынія, Венгрыя, Польшча, Германія, Аўстрыя і інш., прывяла да ўзнікнення сістэмы міжнароднага права па забеспячэнню правоў нацыянальных меншасцяў.

Адносна нацыянальнай палітыкі яшчэ перад адраджэннем Польшчы вылучыліся дзве канцэпцыі. Першая, найлепей сфармуляваная нацыянальна-дэмакратычным рухам, была развіццём формулы, якая агалошвала перавагу нацыянальных інтарэсаў у адносінах да дзяржавы і грамадства, а таксама прызнавала натуральнасць нацыянальных канфліктаў [1, с. 62].

Адпаведна гэтай канцэпцыі ролю гаранта стабільнасці і незалежнасці польскай дзяржавы павінен быў выконваць польскі народ, бо валодаў значнай перавагай у гаспадарчым жыцці і культурным развіцці перад астатнімі. Іншыя народнасці павінны былі падпарадкавацца гэтай палітычнай, эканамічнай і культурнай перавазе палякаў. Такая праграма адмаўляла няпольскім жыхарам дзяржавы права на свабоднае нацыянальнае жыццё, робячы з іх грамадзян ніжэйшай катэгорыі. Канкрэтна гэта прыводзіла да паланізацыі беларусаў і ўкраінцаў [1, с. 303], ізаляцыі яўрэяў ад грамадскага жыцця і аслаблення гаспадарчай і палітычнай пазіцыі немцаў, а ў перспектыве павінна была адбыцца паланізацыя занятых імі тэрыторый. Выразам гэтай дактрыны была тэрытарыяльная праграма Народнай Дэмакратыі, вядомая пад назвай «інкарпарацыйнай» [1, с. 320].

У апазіцыі да нацыяналістычнай думкі заставаліся прапагандуючыя вырашэнне нацыянальнага пытання праз талерантнасць і суіснаванне. Яны зыходзілі з таго, што механізмы стварэння I Рэчы Паспалітай змогуць дапамагчы стварыць новую, другую, Рэч Паспалітую ўжо ў федэратыўнай форме [2, с. 23]. Пры гэтым уступленне ў федэрацыю павінна быць дабраахвотным, а сам федэратыўны тып дзяржавы павінен прывясці да дэмакратызацыі ўнутраных стасункаў і гарантаванага прызнання праў усіх народнасцяў. Адну з перашкод поглядаў федэралістаў, на погляд аўтара, складала думка, што этнічныя межы ва Ўсходняй Еўропе немагчыма вызначыць, а права на самавызначэнне належыць таксама палякам, якія пражываюць на Ўсход ад Сана і Буга; у гэтым выпадку праграма была прадстаўлена як прыклад рэалізацыі права на самавызначэнне народаў [3, с. 488]. Частка польскіх палітыкаў, а перш за ўсё Ю.Пілсудскі, выкарыстаўвала федэрацыйную канцэпцыю пераважна для вырашэння нейкіх тактычных пытанняў.

Тыповай праявай такога становішча былі спрэчкі ў польскай дэлегацыі перад парыжскім кангрэсам. Польскія нацыянал-дэмакраты начале з Р.Дмоўскім выступалі за стварэнне моцнай дзяржавы паміж Германіяй і Расіяй. З гэтай нагоды Р.Дмоўскі лічыў, што «федэрацыя – гэта слабасць, а не сіла, таму што ўласна няма з кім стварадь федэрацыю. Якое ж панства створыць та Літва? У межах гістарычных, то хто там будзе кіраваць, з кім стварадь федэрацыю? Не магчыма ўявіць у Еўропе краіну, у якой бы панавала такая каша з адногот боку элементу літоўскага, з другога боку элементу беларускага, з трэццяга боку напалову бальшавіцкай напалову антыпольскай яўрэйскай анархіі, і ўрэшце, чацьвёртага боку – польскага насельніцтва, апіраючагася на буйную зямельную ўласнасць, якая там хутка знікае».

У рамках дыскуссіі па гэтай праблеме Антоні Суйкоўскі прапанаваў адваротнае: аставіць этнічную Літву па-за межамі Польшчы; прадухіліць канчатковы падзел беларускай народнасці ў выніку інкарпарацыі і русіфікацыі ўсходняй часткі; у створанай федэрацыі павінен існаваць відавочны падзел паўнамоцтваў паміж суб’ектамі (Польшча, Літва (!!!) і Украіна) і цэнтрам. Такім чынам, унутраная сітуацыя ў Польшчы спрыяла доў-

гаму абмеркаванню і калегіяльнаму вырашэнню праблемы нацыянальных меншасцяў. У выпадку гвалтоўнага вырашэння гэтага пытання на карысць прыхільнікаў інкарпарацыі новая польская дзяржава атрымоўвала значныя ўнутраныя праблемы ў міжнацыянальных адносінах.

Трактаты аб правах нацыянальных меншасцяў былі падпісаныя ў аднабаковым парадку прадстаўнікамі малых дзяржаў. Другі бок – вялікія еўрапейскія дзяржавы ў адносінах да сябе ніякіх абавязкаў не прымалі. У выніку заключэння Версальскіх пагадненняў узнікшыя дзяржавы вымушаны былі падпісваць не толькі агульныя дакументы, але таксама, пад ціскам вялікіх дзяржаў, і дамоўленасці аб правах нацыянальных меншасцяў. Дагавор з Польшчай быў падпісаны першым 28 чэрвеня 1919 года ў Версалі і ўступіў у сілу разам з Версальскім дагаворам 10 снежня 1920 года. Падобная сітуацыя растлумачвалася проста – дзяржаў-пераможцаў найбольш хвалявала вырашэнне праблемы Горнага Шлёнска і іншых тэрыторый былой кайзераўскай Германіі, якія адыходзілі да Польшчы. Горны Шлёнск значны час належыў Германіі, і плебісцыт аб уключэнні яе ў склад Польшчы месцамі выліваўся ў узброеныя сутыкненні немцаў і палякаў. Далейшае развіццё сітуацыі падмацоўвае нашу канцэпцыю: 15 мая 1922 г. Польшча на перамовах з Германіяй у Жэневе прыняла далёка ідучыя абавязкі ў адносінах да нямецкай меншасці, у Лізе Нацый адразу (16 мая 1922 года) ствараўся механізм назірання за правамі нямецкай меншасці на працягу 15 гадоў [4, с. 12]. Гэтыя дамоўленасці прадугледжвалі правы па набыцці грамадзянства, агульнавядомыя грамадзянскія правы (роўнасць, ахова жыцця, свабоды і г.д.), а таксама пэўныя правы нацыянальнай меншасці. Адной з галоўных падстаў для рэалізацыі гэтых праваў былі вынікі перапісаў насельніцтва [4, с. 53], ствараючы з перапісу падзею, значна ўплываўшую на нацыянальную палітыку польскай дзяржавы. Нягледзячы на універсальнасць юрыдычных норм па абароне праў нацыянальных меншасцяў ІІ Рэчы Паспалітай, фактычна галоўныя бакі версальскіх дамоўленасцяў былі накіраваны толькі на развязанне праблемы Горнага Шлёнска.

Аб поглядах краін Антанты на праблему славянскіх меншасцяў Польшчы можна дагадвацца па прапанове лорда Керзона (т.зв. «Лініі Керзона»). Падобная прапанова сведчыць аб тым, што вырашэнне гэтай праблемы Антанта бачыла ў пабудове рэгіянальнай сістэмы міжнароднага права, у якой павінны былі ўдзельнічаць і краіны са складу былой Расійскай Імперыі. Ва ўсялякім разе, краіны Антанты не лічылі мэтазгодным уключэнне беларускіх, украінскіх і літоўскіх земляў у склад Польшчы. Агульнавядомая недасканаласць версальскай сістэмы адбілася і на становішчы беларускай нацыянальнай меньшасці ў ІІ Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на распрацаваную сістэму абароны правоў, яна павінна была ўдакладняцца праз заключэнне рэгіянальных дагавароў і праз стварэнне нацыянальных інстытутаў абароны нацыянальных меншасцяў.

*Літаратура і крыніцы*

1. Wapicski R., Z dziejyw tendencji nacjonalistycznych. O stanowisku Narodowej Demokracji wobec kwestii narodowej w latach 1893-1939 // Kwartalnik Historyczny. – 1973. – № 4.
2. Tymieniecka A., Polityka Polskiej Partii Socjalistycznej w latach 1924 – 1928. – Warszawa, 1969.
3. Grunberg K., Polskie koncepcje federalistyczne 1864–1918. – Warszawa, 1971.
4. Kutrzeba St. Mniejszosci narodowe w najnowszem prawe. – Lwow. 1925